УДК930.2-77(476)

# КЛІРАВЫЯ ВЕДАМАСЦІ ЦЭРКВАЎ МІНСКАЙ ЕПАРХІІ ЯК КРЫНІЦА ПА СТАНЕ ПРЫХОДАЎ (па матэрыялах нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі)

**Антановіч Зінаіда Васільеўна,**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*Аўтарам разглядаецца інфармацыйны патэнцыял звестак пра прыход з кліравых ведамасцей Мінскай епархіі. На працягу XIX ст. адбывалася пашырэнне зместу гэтых крыніц і іх структураванне, аднак асноўная інфармацыя, у т.л. пра стан царкоўнага прыходу, працягвала ўносіцца. Улічваючы захаванасць і масавы характар гэтага віду крыніц, іх звесткі могуць выкарыстоўвацца ў даследаваннях па дэмаграфічнай статыстыцы, генеалогіі, краязнаўстве, гісторыі штодзённасці і інш., але патрабуюць дадатковай верыфікацыі і прыцягнення колькасных (інфармацыйных) метадаў.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Праваслаўная царква на беларускіх землях у перыяд іх уваходжання ў склад Расійскай імперыі была сярод распаўсюджаных канфесій і карысталася падтрымкай з боку дзяржавы, што адбілася на колькасці яе прадстаўніцтваў. Ніжэйшымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі царквы былі прыходы, масавымі крыніцамі пра якія з'яўляюцца штогадовыя кліравыя ведамасці, якія складаліся духавенствам і завяраліся з пачатку XIX ст. благачыннымі. У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі гэтыя крыніцы найлепш захаваліся па Мінскай епархіі: каля 830 спраў за 1796–1809, 1811–1904, 1906, 1908, 1912–1913 гг. [2, воп. 1, спр. 40389–41234]. Акрамя звестак пра духавенства і царкоўнаслужачых, якія акцэнтаваліся, у іх пазначаліся нерухомыя маёмасці царквы, вядзенне дакументацыі і інш., а таксама колькасць прыхаджан і населеныя пункты, якія ўваходзілі ў межы прыходу, што можа цікавіць шырокае кола даследчыкаў [4, арк. 1–3].

У гістарыяграфіі маюцца розныя звесткі па этапах змены фармуляру кліравых ведамасцей [16; 17]. У яго развіцці ў Мінскай епархіі можна вылучыць чатыры этапы [1]. Так, у канцы XVIII ст. – 1811 г. (першы этап) выкарыстоўваліся табліцы з 9–10 граф, якія прадстаўлялі кароткую інфармацыю пра царкву, духавенства і прыхаджан. Звесткі пра апошніх абмяжоўваліся колькасцю двароў і насельніцтва праваслаўнага веравызнання ў іх. Пазначаліся і землеўласнікі, маёмасці якіх уваходзілі ў тэрытарыяльныя межы прыходаў. З 1802–1803 гг. інфарматыўнасць інфармацыі пра прыход узрастае за кошт пераліку населеных пунктаў у ім. Ведамасці з гэтага часу падпісваў благачынны.

У 1812 г. (другі этап) уводзіцца дзяленне ведамасці на дзве выразныя больш падрабязныя ў параўнанні з папярэднім этапам часткі (табліцы) – пра прыход і духавенства. Напрыклад, у ведамасці Уваскрасенскай царквы ў с. Бунча Мазырскага пав. у гэты час пазначана 182 прыхаджаніна пераважна сялянскага паходжання, а таксама адзначана, што не было стараавераў і ўніятаў [5, арк. 1–3]. У прыходзе Даманавіцкай царквы Рэчыцкага пав. ў 1817 г. было дзевяць жанчын уніяцкага веравызнання [6, арк. 42 адв.–43], а ў Рэчыцкай Васкрасенскай царкве – сем мужчын і пяць жанчын-стараавераў [6, арк. 83 адв.–84]. У Слуцкім прыходзе Раства Хрыстова ў 1820 г. не было стараавераў і ўніятаў, але было 11 католікаў [7, арк. 14]. У вялікіх па колькасці прыхаджан прыходах, у прыватнасці, у г. Мінску адзначалася наяўнасць іншаверных, але адсутнічалі колькасныя звесткі [8, арк. 13–16]. Цікавы запіс маецца па шэрагу цэркваў, у т.л. Пінскага пав. за 1828 г., што прыхаджане "совратились из благочестия в унию", у выніку чаго многія прыходы засталіся без прыхаджан [9, арк. 11–16, 27–28, 29–31, 36–38, 46–47, 51–53, 73–74, 85–86]. Нягледзячы на тое, што яшчэ ў 1817 г. мінскі епіскап дадаткова запатрабаваў звесткі пра магчымасці аб'яднання прыходаў [3, арк. 3–4], яны не ліквідаваліся. Відавочнымі прычынамі з'яўляліся аддаленасць ад іншых цэркваў і магчымасці аднаўлення прыходаў.

У 1829 г. (трэці этап) адбылося падзяленне фармуляру кліравых ведамасцей на тры часткі – пра царкву, прычт і прыход. У трэцяй частцы кліравай ведамасці адначалася месца жыхарства і саслоўная прыналежнасць прыхаджан, а таксама працягвала ўключацца інфармацыя пра колькасць двароў і жыхароў праваслаўнага веравызнання ў іх, наяўнасць іншаверных у прыходзе, аддаленасць ад царквы і складанасцей у доступе да яе. Апошняе адзначалася рэдка.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Так, прыхаджане Блужскай царквы не маглі яе наведваць падчас палаводдзя рэк Свіслачы і Талькі з-за стану мастоў, бродаў, а таксама балоцістай мясцовасці [13, арк. 24 адв.]. Нягледзячы на ўнесеныя ў раздзел змены і традыцыі яго запаўнення, не з'явілася графа з пазначэннем колькасці асоб іншаслаўных веравызнанняў, хаця гэтыя звесткі святары працягвалі ўносіць [10, арк. 2–7]. У 1850-я гг. у сувязі з міжканфесіянальнымі разборамі прыхаджан да кліравых ведамасцей маглі таксама дадаваць спісы або абагуленыя звесткі пра далучаных да праваслаўя асоб [11, арк. ]. У 1870-я гг. пазначэнне іншаверных адбывалася эпізадычна [12].

З 1895 г. (чацверты этап) пачынаецца выкарыстанне фармуляра кліравых ведамасцей, выробленага ў Маскоўскай сінадальнай друкарні, які ўключаў чатыры раздзелы. Уводзяцца адзначэнне прыходскіх школ і крыніц іх утрымання, колькасць навучэнцаў [1]. Звесткі маглі падавацца падрабязныя. Напрыклад, у с. Зачысце з 1864 г. дзейнічала народнае вучылішча, а прыходская школа была адкрыта ў 1891 г. у в. Новае Янчына, дзе навучаліся салдат і 10 хлопчыкаў [14, арк. 145]. У 1912 г. ва ўжытак уведзена адноўленая структура гэтага раздзела, якая нарэшце ўключыла колькасць іншаверных у межах прыходу, у т.л. нехрысціян. Пры гэтым акцэнтавалася ўвага на "сектантах" з пазначэннем плыняў [15, арк. 2–6 адв.].

Такім чынам, крыніцазнаўчы патэнцыял кліравых ведамасцей не абмяжоўваецца звесткамі пра клір, стан царкоўных пабудоў і маёмасці, чаму звычайна надаецца ўвага ў гістарыяграфіі. Асобнай увагі патрабуе частка (раздзел) гэтай крыніцы, прысвечаны характарыстыцы прыходу. Улічваючы, што інфармацыя ўносілася зацікаўленымі ў статыстычных паказчыках асобамі, звесткі па дэмаграфічнай статыстыцы і саслоўным складзе прыходаў патрабуюць верыфікацыі. Міжканфесіянальныя адносіны адлюстраваны ў адзначэнні колькасці насельніцтва іншаслаўных веравызнанняў і колькасці далучаных да праваслаўя. Змены ў межах прыходаў будуць карыснымі для гісторыкаў канфесій, генеалогаў, картографаў, краязнаўцаў і даследчыкаў гісторыі штодзённасці. Нягледзячы на адзначаны шырокі інфармацыйны патэнцыял, звесткі пра прыходы з кліравых ведамасцей пакуль недастаткова даследаваны па прычыне неабходнасці верыфікацыі і патрабавання прыцягнення колькасных (інфармацыйных) метадаў для іх апрацоўкі.

## Літаратура


1. Антановіч, З.В. Кліравыя ведамасці Мінскай епархіі як гістарычная крыніца (па матэрыялах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) /З.В. Антановіч // Беларускі археаграфічны штогоднік. – Мінск: БелНДІДАС, 2018. – Выпуск 19. – С. 51–60.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 136.
3. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 4176.
4. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40406.
5. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40482.
6. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40516.
7. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40538.
8. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40562.
9. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40594.
10. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40603.
11. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40787.
12. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40946.
13. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41002.
14. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41043.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

15. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41152.

16. Спичак, А. В. Эволюция оформления клировых ведомостей в Тобольской епархии в XVIII — начале XX веков / А. В. Спичак // Научный диалог. – 2015. – № 12 (48). – С. 328–338.

17. Чибисов, М. Е. Клировые ведомости как источник по истории приходов Барнаульского духовного правления Колывано-Воскресенского (Алтайского) горного округа (1804–1864 гг.) : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.09. – Барнаул, 2006 – 243 с. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.dslib.net/istorio-grafia/klirovye-vedomosti-kak-istochnik-po-istorii-prihodov-barnaulskogo-duhovnogo.html. – Дата доступа: 11.02.2019.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова